# АДКУЛЬ ПРЫЙШЛО ХРЫСЦІЯНСТВА НА БЕЛАРУСЬ?

*УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі”*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Васілеўскі Я.Д.*

*Мікалаева Л.В., к.г.н., дацэнт*

У дакладзе прадстаўлены аналіз версій магчымах шляхоў хрысціянізацыі беларускіх зямель.

У патоку акружаючай нас інфармацыі нават спрактыкаванаму ў гісторыка-багаслоўскіх пытаннях чалавеку цяжка зразумець, адкуль узялося хрысціянства на Беларусі, якім яно было першапачаткова, як развівалася. Дагмат аб тым, што Полацкае княства было састаўной часткай Кіеўскай Русі, меў на увазе, што і хрышчэнне гэтых зямель нічым не адрознівалася ад Кіева ці Ноўгарада. Але ці так гэта было на самой справе? У пытанні аб шляхах пранікнення хрысціянства на беларускія землі маецца даволі значная блытаніна.

Свой афіцыйны адлік гісторыя хрысціянскай царквы на Беларусі пачынае з 992 г., калі яна яшчэ не зведала расколу 1054 г., з часу стварэння Полацкай епархіі. Аднак, даследчыкі выказваюць меркаванне, што хрысціянства была вядома на беларускіх землях задоўга да 992 г. Першымі хрысціянамі на Беларусі маглі стаць мясцовыя купцы. Прыняцце імі гэтай веры было абумоўлена зручнасцю вядзення ганлёвых спраў з хрысціянскімі краінамі. Выхадцы з беларускіх зямель, што ўдзельнічалі ў паходах на Візантыю, маглі прыняць новую веру яшчэ да хрышчэння Русі. Яна трапляла ў наш край і іншымі шляхамі: у ходзе дзелавых кантактаў, дынастычных шлюбаў, праз місіянераў. Яна магла пранікаць на Беларусь не толькі з Кіева ці праз Кіеў, але і ў ходзе непасрэдных кантактаў Полацкага княства з Візантыяй. Некаторыя беларускія даследчыкі сцвярджаюць, што працэс распаўсюджвання новага веравызнання на Полаччыне на пачатку ішоў незалежна ад хрысціянізацыі Кіева і Ноўгарада. Ёсць меркаванне, што першыя епіскапы былі дасланы ў Кіеў, Ноўгарад і Полацк з балгарскай Ахрыдскай аўтакефальнай царквы. Яна была праваслаўнага накірунку ў статусе патрыярхату і роўнай візантыйскай Канстанцінопальскай царкве.

Пачатак масавага распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях большасць даследчыкаў звязвае з палітыкай кіеўскага князя Уладзіміра, які каля 988 г. ажыццявіў хрышчэнне Русі. Ва ўсіх вядомых нам рэдакцыях і спісах “Аповесці мінулых гадоў” услед за летапіснай ацэнкай хрышчэння Русі: “Володимер же просвещен сам, и сынове его, и земля его”, – ідзе аповяд аб раздачы вялікім князем сваім важнейшых гарадоў Русі. Ізяслава, сына ад Рагнеды, ён зрабіў полацкім князем, Святаполка пасадзіў у Тураве. Не падлягае сумненню, што кіеўскі князь рабіў на іх стаўку ў правядзенні агульнадзяржаўнай палітыкі хрысціянізацыі ва ўдзелах. Пры іх у буйных гарадах княстваў пачалі ствараецца епархіі – тэрытарыяльныя царкоўныя акругі, якімі кіравалі епіскапы. Епіскапскія кафедры былі духоўнымі цэнтрамі, з якіх распаўсюджвалася і ўмацоўвалася праваслаўная вера і развівалася царкоўна-рэлігійнае жыццё, утвараліся хрысціянскія абшчыны, будаваліся храмы, манастыры і школы.

Хто стаў першым полацкім епіскапам, летапісы не паведамляюць. Першым, вядомым нам, быў кіева-пячорскі манах Міна, пасвечаны ў епіскапскі сан у 1105 г. Крыніцы змяшчаюць звесткі яшчэ аб сямі полацкіх епіскапах XII – XIII стст.: Ілля, Касьма, пастаўлены ў 1143 г., Дыянісій памёр у 1183 г., яго наступнік Мікалай; Аляксей, упамянуты каля 1231 г., Сімяон, упамянуты каля 1274 г., Іакаў, вядомы па дакументу прыкладна 1300 г. Даследчыкі лічаць, што першымі хрысціянскімі святарамі, епіскапамі на Беларусі былі грэкі і балгары.

Верагодна, працэс распаўсюджвання новай рэлігіі на нашых землях праходзіў мірна. У летапісах няма сведчанняў пра паўстанні падчас хрысціянізацыі на Беларусі. Ускосныя звесткі датычаць толькі Тураўшчыны.

Некаторыя даследчыкі прытрымліваюцца меркавання, што хрысціянства магло прыйсці на Полаччыну з захаду. Прыхільнік гэтай гіпотэзы С. Тарасаў аргументуе яе сведчаннямі ісландскай “Сагі аб хрышчэнні”. Яна распавядае аб місіянеры Торвальдзе па прозвішчу Вандроўнік, які прайшоўшы паломніцкі шлях у Палесціну, вяртаўся да сябе на радзіму праз Полацк. Па дарозе ён памёр і быў пахаваны каля Полацка пры царкве Святога Іаана. Аднак падзеі, пра якія ідзе размова ў “Сазе”, адбываліся каля 1101 ці 1002 г., г. зн. праз 12 – 13 гадоў пасля афіцыйнага прыняцця хрысціянства. Некаторыя прыхільнікі ідэі заходняга пранікнення хрысціянства прыводзяць у якаясці аргументаў факты прысутнасці ў Полацку ў XII – XIII стст. каталіцкіх храмаў. Але яны ўзнікалі ў гарадах, што мелі кантакты з гарадамі Ганзейскага саюза. У іх ствараліся факторыі – экстэрытарыяльныя цэнтры. Такія цэрквы існавалі і ў Смаленску, Віцебску. Іх святарам забаранялася весці агітацыю сярод мясцовага насельніцтва. Гэта былі цэрквы для замежных купцоў.

Хрысціянізацыя Тураўскай зямлі пачалася пры Святаполку (988 – 1015 – князь тураўскі, 1015 – 1019 – вялікі князь кіеўскі і князь тураўскі), больш вядомым як “Акаянны”. У 1005 г. была ўтворана Тураўская епархія. Першым тураўскім епіскапам быў пастаўлены Фама. Яго ўлада распаўсюджвалася на вялікую тэрыторыю Заходняй Беларусі і частку Валыні. У адрозненне ад Ізяслава, Святаполк паказаў сябе прыхільнікам заходняга хрысціянства (нагадаем, што размова ідзе пра часы, калі хрысціянства яшчэ фармальна заставалася адзіным). Ён ажаніўся з прыхільніцай заходняга накірунку ў хрысціянстве, наблізіў да сябе калабжэгскага епіскапа Рэйнберна. У некаторай ступені з-за веры паміж Святаполкам і яго бацькам Уладзімірам адбылася сварка, у выніку якой тураўскі князь, яго жонка і Рэйнберн былі пасаджаны ў турму. Апошні там і памёр. Пазнейшая гісторыя Тураўшчыны было ўжо звязана з рэлігіяй кіеўскіх князёў. Аднак факты місіянерскай дзейнасці лацінскіх прапаведнікаў на Русі ў XI ст. не з’яўляюцца беспадстаўнымі. Заходняя царква таксама цікавілася пытаннямі хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх зямель.

Такім чынам, у наш час сярод версій аб шляхах пранікнення хрысціянства на землі сучаснай Беларусі большасць прыхільнікаў па-ранейшаму мае версія аб хрысціянізацыі праз Кіеў з Канстанцінопаля. Аднак маюцца таксама і альтэрнатыўныя пункты погляду. У цэлым жа прыняцце хрысціянства з’явілася адной з важнейшых падзей гісторыі Беларусі. На працягу стагоддзяў праваслаўная царква аказвала моцны ўплыў на ўсе бакі жыцця нашых продкаў, на іх культуру, мараль, побыт, дзяржаўныя інстытуты і адносіны з суседнімі краінамі.